Салаўёў, П.Л. Выпускі навін замежных (англамоўных) СМІ як сродак фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў-журналістаў / П.Л. Салаўёў // Журналістыка – 2003: матэрыялы 5-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. Вып. 5 // Рэдкал.: С.В.Дубовік (адк. рэд.) і інш. – Мінск, БДУ, 2003.

*П. Л. Салаўёў*
*Мінск, БДУ*

# Выпускі навін замежных (англамоўных) СМІ як сродак фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў-журналістаў

На сучасным этапе сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства праблема фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці паўстала надзвычай востра, што звязана з павышэннем патрабаванняў да спецыяліста. Перад усёй сістэмай адукацыі стаіць задача максімальнага раскрыцця індывідуальнага творчага патэнцыялу кожнай асобы, а сам працэс навучання ўсё больша адыходзіць ад інфармацыйнай мадэлі да мадэлі, што развівае гэты творчы патэнцыял.

У грамадстве змяніліся адносіны да адукацыі наогул, наяўнасць якаснай адукацыі стала гарантыяй будучай кар’еры і матэрыяльнай забяспечанасці. Такім чынам, сур’ёзна паўстае пытанне пра якасць адукаванасці журналіста, яго кампетэнтнасці, якая б дазволіла яму ажыццяўляць сваю прафесійную дзейнасць больш эфектыўна.

У педагагічнай навуцы прафесійная кампетэнтнасць разглядаецца:

1) як мэта адукацыі, прафесійнай падрыхтоўкі;

2) як прамежкавы вынік, што характарызуе стан спецыяліста, які ажыццяўляе сваю прафесійную дзейнасць.

Адзначаецца таксама, што выпускнік ВНУ не можа быць спецыялістам, які дасягнуў найвышэйшага ўзроўню прафесійнага майстэрства, але ён павінен валодаць тымі сродкамі, якія дазволілі б яму павышаць сваю кваліфікацыю ў прафесійным плане.

Авалоданне англійскай мовай у наш час становіцца адным з неад’емных патрабаванняў прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў-журналістаў. Гэта найперш звязана з тым, што англійская мова з’яўляецца амаль поўным манапалістам у сістэме зносін наогул і ў прафесійнай дзейнасці журналіста, паколькі гэта мова – мова большасці самых

знакамітых і папулярных газет, мова тэлекампаній-гігантаў, мова інфармацыйных агентстваў, мова сусветнай сеткі Internet.

Працэс навучання англійскай мове разумеецца, перш за ўсё, як мэтанакіраванае фарміраванне спецыяльных уменняў і навыкаў у сферы моўнай і маўленчай дзейнасці, што ажыццяўляецца ў рамках пэўнай метадычнай праграмы, якая абумоўлівае змест, спосаб і формы арганізацыі навучальнага матэрыялу. Дадзены працэс навучання не можа быць механічным у сувязі з тым, што ён накіраваня на фарміраванне і развіццё асобы будучага журналіста як суб’екта актыўнай творчай дзейнасці.

Асноўнай мэтай навучання англійскай мове з’яўляецца забеспячэнне высокага ўзроўню ведаў і навыкаў валодання іншамоўнай камунікацыяй у адпаведнасці з прафесійным профілем будучых спецыялістаў (у дадзеным выпадку – студэнтаў-журналістаў). Навучанне англійскай мове, а асабліва англійскай мове для спецыяльных мэтаў (English for Specific Purposes – ESP), у апошні час стала адной з самых важных галін метадычных і акадэмічных даследаванняў. Навучанне ў прафесійных мэтах павінна быць заснавана на агульным веданні мовы і патрабуе максімальнай гнуткасці і разумення прафесійных патрэб навучэнцаў, іх матывацыі і канчатковых мэт навучання. На жаль, у сусветнай практыцы не вылучана асобнае адгалінаванне “Англійская мова для журналістаў”, тым не менш дадзены напрамак распрацоўваецца ў некалькіх ВНУ, у тым ліку і на кафедры англійскай мовы і маўленчай камунікацыі.

Змены міжнароднай сітуацыі ў свеце ставяць перад журналістамі шэраг скаладаных, комплексных мэт, а таксама патрабуюць асаблівых якасцей у іх прафесійнай падрыхтоўцы. Развіццё новых сродкаў масавай інфармацыі, электронных сістэм і фарматаў, змены характару передачы і атрымання інфармацыі патрабуюць ад студэнтаў-журналістаў не толькі агульнага ведання замежнай мовы, але і ведання спецыфічных момантаў, неабходных для паспяховага ажыццяўлення творчай прафесійнай дзейнасці.

Адным са сродкаў, якія робяць працэс навучання англійскай мове жывым і творчым і фарміруюць прафесійную кампетэнтасць, з’яўляецца выкарыстанне ў працэсе навучання інфармацыйных тэхналогій у выглядзе

навін замежных (англамоўных) сродкаў масавай інфармацыі. Выкарыстанне такой формы правядзення заняткаў па англійскай мове ў межах англійскай мовы для спецыяльных мэтаў значна павышае зацікаўленасць студэнтаў і дазваляе больш эфектыўна выкарыстоўваць прыёмы актыўнага ўзаемадзеяння.

Прагляд навін замежных тэлекампаній (такіх як BBC, Euronews, CNN і інш.) з’яўляецца дзейсным сродкам фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў-журналістаў, паколькі дазваляе пазнаеміцца са спецыфічнымі асаблівасцямі функцыянавання замежных электронных сродкаў масавай інфармацыі, характарам іх інфармацыйнай і камунікацыйнай дзейнасці.

У межах заняткаў па англійскай мове з выкарыстаннем аўтэнтычных блокаў навін асаблівая ўвага надаецца аналізу спецыфікі іх генерацыі і функцыянавання, крытэрыям адбору матэрыялу для выпускаў тэлевізійных навін, раскрываецца адрозненне паміж навінамі ў друкаваных сродках масавай інфармацыі і на тэлебачанні.

Увага надаецца таксама і тыпалогіі навін, у межах якой студэнты знаёмяцца з рознымі тыпамі класіфікацыі, якія выкарыстоўваюцца на Захадзе. Разглядаюцца пытанні структуры і кампанентнага складу блока навін, параўноваецца структура выпускаў навін айчынных (у тым ліку і былых савецкіх) і замежных тэлекампаній. Студэнты атрымліваюць веды ў сферы спецыфічных асаблівасцей мовы тэлевізійных навін, знаёмяцца з асновамі этычных паводзін журналістаў, што прынятыя ў замежных сродках масавай інфармацыі. Асаблівая ўвага надаецца маральным і сацыякультурным аспектам, такім як журналісцкая перадузятасць, спосабам яе вызначэння, сродкам яе рэпрэзентацыі і метадам яе выключэння. Фарміраванню прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў-журналістаў садзейнічае разгляд асаблівасцей тэлевізійных стэрэатыпаў, што існуюць на Захадзе, і спецыфікі мэтавай аудыторыі.

Студэнты атрымліваюць каштоўны досвед у галіне сваёй прафесійнай дзейнасці, знаёмяцца з асновамі тэрміналогіі, звязанай са светам замежных сродкаў масавай інфармацыі, пашыраюць сваю дасведчанасць, атрымліваюць магчымасць прафесійнага ўдасканалення.

Фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў-журналістаў у межах прагляду навін замежных (англамоўных) тэлекампаній заснавана таксама і на вялікай ролі сацыякультурнага кампанента ў выглядзе краіназнаўчай інфармацыі, тым больш, што сацыякультурны кампанент садзейнічае больш асэнсаванаму авалоданню замежнай мовай як сродкам зносін.

**Салаўёў, П.Л. Выпускі навін замежных (англамоўных) СМІ як сродак фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў-журналістаў / П.Л. Салаўёў // Журналістыка – 2003: матэрыялы 5-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. Вып. 5 // Рэдкал.: С.В.Дубовік (адк. рэд.) і інш. – Мінск, БДУ, 2003.**